# МЕТАДАЛАГІЧНА-ПАЗНАВАЛЬНАЕ І КУЛЬТУРА-ВЫХАВАЎЧАЕ ЗНАЧЭННЕ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ГІСТОРЫЯ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ”

**Т.І. Доўнар**
*прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар юрыдычных навук, прафесар*

Нельга не заўважыць, што на сучасным этапе развіцця беларускай дзяржаўнасці вышэйшая адукацыя становіцца тым важным фактарам дзяржаўнага развіцця, які садзейнічае вырашэнню эканамічных, палітычных, сацыяльных, культурных і іншых праблем сучаснага грамадства. У сваю чаргу гэты фактар вызначае і важнейшыя мэты адукацыі, якія ў апошнія гады на ўзроўні масавага ўяўлення некалькі змяніліся. Так, напрыклад, калі раней у адносінах да прафесійнай адукацыі было пашырана грамадскае меркаванне, што вышэйшая школа павінна галоўным чынам рыхтаваць кваліфікаваных спецыялістаў, то на пачатку XXI ст. яно пачало схіляцца да неабходнасці падрыхтоўкі перш за ўсё высокаадукаваных і культурных асоб.

Адпаведна гэтаму змяняецца і сутнасць сучаснай адукацыі, бо яна зараз не можа кіравацца папярэднімі традыцыямі адукацыйнай сістэмы і павінна перш за ўсё садзейнічаць развіццю індывідуума. Менавіта таму самаадукацыя, дыстанцыйныя адукацыйныя праграмы, інфармацыйныя тэхналогіі становяцца неад’емнай часткай сучаснай сістэмы адукацыі і падставай далейшага ўдасканалення падрыхтоўкі прафесіяналаў з вышэйшай адукацыяй. Зразумела, у аснову дзяржаўнай стратэгіі развіцця адукацыі павінен быць пакладзены сацыяльны заказ грамадства, які зараз скіраваны на аптымальнае спалучэнне інтарэсаў навучэнца і патрэб грамадства, падрыхтоўку спецыялістаў шырокага профілю, што дазваляе забяспечыць даступнасць адукацыі, арыентаванасць асобы на развіццё ўласных навыкаў і ўсебаковае духоўнае развіццё.

Фарміраванне арыентаванасці будучых спецыялістаў і каштоўнасных установак асобы адбываецца ў большасці ў вышэйшай школе і вядучая роля ў вырашэнні гэтай складанай задачы належыць гуманітарным навукам. Менавіта яны фарміруюць сістэму светапогляду асобы студента, вызначаюць яе інтэлектуальнае і духоўнае развіццё, садзейнічаюць станаўленню ў студэнта тых якасцей, якія дазволяць у дальнейшым адказна выконваць свае прафесійныя і грамадзянскія функцыі.

Сярод гуманітарных дысцыплін у сістэме падрыхтоўкі прафесійных юрыстаў важнае месца належыць гісторыі дзяржавы і права Беларусі, якая ў якасці гістарычнай навукі ўяўляе сабой частку гісторыі чалавецтва, а ў якасці юрыдычнай — адну з фундаментальных галін ведаў, на якіх грунтуюцца дасягненні і высновы юрыспрудэнцыі ў цэлым. Менавіта гэты прадмет з’яўляецца адной з тых фундаментальных дысцыплін, якія з’яўляюцца

падставай для вывучэння іншых юрыдычных дысцыплін. У сваю чаргу прадмет грунтуецца на дасягненнях гістарычнай і гісторыка-прававой навукі.

Прадметам вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Гісторыя дзяржавы і права Беларусі" з'яўляецца сістэма ведаў аб узнікненні і эвалюцыі беларускай дзяржаўнасці, найбольш важных этапах, тэндэнцыях і асаблівасцях гістарычнага развіцця дзяржавы і права Беларусі [1, с. 3]. Як вучэбная дысцыпліна, «Гісторыя дзяржавы і права Беларусі» мае мэтай – даць веды студэнтам аб канцэптуальных асновах, храналагічнай паслядоўнасці і асноўных этапах развіцця беларускай дзяржаўнасці і прававой сістэмы; іх асаблівасцях і характэрных рысах; эвалюцыі важнейшых прававых інстытутаў і галін права; дасягненнях прававой культуры Беларусі. Вучэбная дысцыпліна дае студэнтам не толькі агульнае ўяўленне аб стане, характэрных рысах і тэндэнцыях развіцця айчыннай дзяржавы і яе права, але перш за ўсё дапамагае асэнсаваць узровень развіцця беларускай дзяржаўнасці і яе прававой культуры на тым ці іншым гістарычным этапе, выявіць ролю народа ў гістарычным працэсе і месца асобы ў грамадстве.

Такім чынам, вучэбная дысцыпліна накіравана на выяўленне і асэнсаванне характэрных рыс і асаблівасцей дзяржаўна-прававога развіцця Беларусі на папярэдніх гістарычных этапах, а таксама на разуменне значэння сучаснай беларускай дзяржавы і айчыннай прававой сферы. Перш за ўсё яна прызначана даць яснае і глыбокае разуменне заканамернасцей гістарычнага працэсу, асаблівасцей узнікнення, станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці на працягу папярэдніх стагоддзяў, у тым ліку адносна прычын змен тыпаў і формаў дзяржавы, эвалюцыі дзяржаўных органаў і палітыка-прававых інстытутаў, змен у прававым становішчы насельніцтва і інш. Пры гэтым вучэбная дысцыпліна садзейнічае набыццю студэнтамі навыкаў абагульнення гістарычнага матэрыялу, умення яго аналізаваць, сістэматызаваць і з навуковых пазіцый фармуляваць належныя вывады. Акрамя таго, прадмет гісторыі дзяржавы і права Беларусі мае на мэце фарміраванне ў студэнтаў прававога мыслення. Гістарычны аналіз заканадаўства неабходны студэнтам-юрыстам для правільнага разумення дзеючага заканадаўства і крытычнай ацэнкі састарэлага нарматыўна-прававога матэрыялу [1, с. 3].

Увогуле папярэдні вопыт юрыспрудэнцыі не толькі дапамагае ў асэнсаванні ранейшых гістарычных дасягненняў і недахопаў, але садзейнічае пазбегнуць мінулых памылак, маючы мэтай, на падставе пераемнасці станоўчага гістарычнага вопыту, больш паспяховае будаўніцтва сучаснай дзяржаўнасці, яе прававых інстытутаў, належнага заканадаўства і іншых элементаў прававой сферы. Акрамя таго, гістарычныя веды, якія даюць падставы праз прызму мінулага заглянуць у будучае, непасрэдна ўплываюць на светаўяўленне студэнтаў і духоўнае развіццё асобы.

Такім чынам, прадмет мае не толькі пазнавальнае, але і метадалагічнае і практычнае значэнне, бо дапамагае студэнтам у фарміраванні правільнага светаўяўлення і выпрацоўцы погляду на дзяржаўнасць як на дынамічны

арганізм, які пастаянна развіваецца ў цеснай узаемасувязі з рэальным грамадска-палітычным і эканамічным становішчам.

У сувязі з тым, што прадмет "Гісторыя дзяржавы і права Беларусі" вывучаецца на першым курсе вышэйшых юрыдычных навучальных установ школьныя ўяўленні першакурснікаў аб гістарычным працэсе развіцця беларускай дзяржаўнасці, як правіла, даволі павярхоўныя і разрозненыя. Пры гэтым студэнты праходзяць складаны перыяд адаптацыі да ўмоў навучання ў вышэйшай навучальнай установе, які ўключае як праблему інтэграцыі ў новую сацыяльную прастору са складанасцю узамемаадносін са студэнтамі, выкладчыкамі, адміністрацыяй, так і новай лекцыйна-практычнай сістэмай навучання, што патрабуе больш значнай самастойнасці і адказнасці. Акрамя таго, амаль кожны выкладчык соцыягуманітарных навук пры выкладанні прадмета сустракаецца з такімі цяжкасцямі, як канкрэтнасць мыслення студэнтаў, пэўная неінфармiраванасць у сферы кніжнай культуры і як наступства – няведанне гуманітарнай тэрміналогіі і няўменне працаваць з першакрыніцамі, а таксама непаразуменне праблемнага характару гуманітарных дысцыплін, у тым ліку непаразуменне, звязанае з наяўнасцю ў прадмеце выкладання некаторых невырашаных, дыскусійных пытанняў. Пры гэтым сучасныя студэнты з лёгкасцю дастаюць любую інфармацыю з электронных крыніц, хоць карыстаюцца ёю, у тым ліку дыферэнцыраваць, аналізаваць і адапціраваць для адказу на семінарскіх занятках, у поўнай меры не могуць. Як правіла, яны з задавальннем адказваюць на пытанні адносна канкрэтных гістарычных падзей, або персаналій, аднак з цяжкасцю ім даюцца пытанні аналізу заканадаўства, выяўлення асаблівасцей і тэндэнцый у развіцці дзяржавы і права, а таксама тыя пытанні, што патрабуюць выяўлення ўзаемасувязей развіцця права з сацыяльна-эканамічнымі, палітычнымі працэсамі ў грамадстве.

Таму зараз застаецца актуальнай праблема ўдасканалення сістэмы вышэйшай адукацыі, у тым ліку ў сферы вывучэння гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Больш патрэбным становіцца не столькі вывучэнне студэнтамі фактaлогіі, як гэта было ў школе, але філасофіі гістарычнага развіцця, што, на наш погляд, будзе садзейнічаць фарміраванню самастойнасці мышлення і пашырэнню кругагляду студэнтаў. Асабліва патрэбна звярнуць увагу не толькі на фарміраванне сістэмы гістарычных ведаў у студэнтаў, але і на іх каштоўнасныя арыентацыі. Увогуле фарміраванне гістарызма мышлення зараз з'яўляецца адным з паказчыкаў культуры адукаванага чалавека. Менавіта таму адной з мэт вывучэння курса з'яўляецца далучэнне асобы студэнта да культурна-гістарычнага кантэксту, самаарыентацыі ў цывілізаваным часе-прасторы.

Належнае вывучэнне дысцыпліны дазваляе сфарміраваць у студэнта зладжаную і дакладную сістэму эканамічных, палітычных, філасофскіх поглядаў адносна гістарычнага развіцця дзяржаўнасці Беларусі, а таксама прывучае маладых людзей самастойна і маштабна мысліць, пазбягаць

аднабаковых, мала звязаных з рэчаіснасцю вывадаў і ацэнкаў. Тым больш, што адносна Беларусі многія гістарычныя дзяржаўна-прававыя пытанні застаюцца яшчэ мала даследаванымі, іншыя ж разглядаюцца навукоўцамі з вельмі супярэчлівых пазіцый [2, с. 39]. Складанасць у вывучэнні гісторыі беларускай дзяржаўнасці, г.зн. дзяржаўна-прававых феноменаў, што існавалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі і на этнічна блізкіх землях, яшчэ і ў тым, што яна перасякаецца з рэтраспекцыяй дзяржаўнасці іншых народаў. Гэта тычыцца і цывілізацыйнай прыналежнасці беларускіх зямель, якія знаходзіліся на мяжы Захаду і Усходу.

Увогуле на сучасным, найноўшым этапе развіцця чалавечай цывілізацыі значна павялічылася значэнне асэнсавання ўласнай гісторыі дзяржаўна-прававога развіцця. Асабліва гістарычныя веды сталі важнымі ва ўмовах вельмі складаных геапалітычных працэсаў ва ўсім свеце. У сувязі з гэтым неабходна акцэнтаваць увагу студэнтаў, што сучасныя патрэбы ў веданні і далейшым развіцці гісторыка-прававой навукі звязаны не толькі з тымі прабеламі, што ў ёй засталіся, але ў сувязі з пастаяннымі трансфармацыямі дзяржаўна-прававой сферы і адпаведна гэтаму - з неабходнасцю перагляду шэрагу папярэдніх уяўленняў аб гістарычным працэсе і эвалюцыі дзяржаўнасці.

Пераасэнсаванне папярэдніх гістарычных і тэарэтыка-прававых навуковых падыходаў адносна такіх палітычных інстытутаў, як дзяржава і права, садзейнічае ўдасканаленню сучаснай дзяржаўна-прававой сферы. Тым больш, што менавіта ў гісторыі права найбольш акрэслена адлюстроўваюцца характэрныя рысы сацыяльна-эканамічнага і палітычнага жыцця народа і тыя змены, якія адбываюцца ў сувязі з развіццём і ўскладненнем гістарычнага працэсу. Рэканструяванне забытых, але блізкіх прававому менталітэту, прававой свядомасці і прававой культуры беларускага народа дзяржаўна-прававых каштоўнасцей, у тым ліку ідэй, прававых інстытутаў, механізма ўрэгулявання грамадскіх адносін і інш., дапамагае не толькі асэнсаваць і ацаніць узровень мінулай прававой культуры грамадства, але і якасна ўплываць на сучаснае функцыянаванне як асобных прававых з’яў так і ўсёй прававой сферы ў цэлым [1, с. 4]. Менавіта навуковы аналіз папярэдняга дзяржаўна-прававога вопыту дазваляе звярнуць увагу на тыя недахопы і дасягненні, якія мелі месца ў мінулым, і ўлічыць гэта пры ўдасканаленні дзяржаўна-прававых інстытутаў, чым потым будуць непасрэдна займацца сучасныя студэнты.

Такім чынам, гісторыка-прававая навука мае асаблівае значэнне ў справе падрыхтоўкі належных юрыстаў-прафесіяналаў, паколькі яна дапамагае прааналізаваць і асэнсаваць папярэдні ход гістарычнага развіцця, улічыць папярэднія дасягненні, выключыць ранейшыя недахопы і на падставе гэтага прагназаваць перспектывы далейшага дзяржаўна-прававога развіцця і прапаноўваць найбольш прымальныя механізмы яго ўдасканалення. Пры гэтым гістарычны аналіз эвалюцыі айчыннай прававой сферы заўсёды мае галоўнай мэтай - удасканаленне ранейшых і фарміраванне новых прававых інстытутаў і іншых элементаў прававой сістэмы, а таксама больш дасканалага

заканадаўства, найболей адэкватнага сучаснай прававой свядомасці. Такі падыход садзейнічае павышэнню эфектыўнасці функцыянавання беларускай дзяржаўнасці як галоўнага на сённяшні момант палітычнага інстытута, які выступае прыладай для дасягнення найлепшага сацыяльна-эканамічнага жыцця грамадзян ва ўмовах усталявання дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы [1, с. 4].

Гэтаму ў значнай ступені будзе садзейнічаць пошук новага зместу і метадалогіі выкладання гісторыі дзяржавы і права Беларусі, што мяркуе пераход да новых тэхналогій навучання, пры якіх логіка вучэбнай дысцыпліны павінна адпавядаць логіцы гісторыка-прававой навукі і ўвогуле логіцы развіцця навуковага пазнання у цэлым. Такі падыход адпавядае мэтам вузаўскай адукацыі, якія накіраваны не толькі на авалоданне студэнтамі ведамі, уменнем і навыкамі, але і іх здольнасць арыентавацца ў вакольным сусвеце. Вельмі важна арыентаваць студэнтаў на веданне імі агульначалавечых духоўных каштоўнасцей, створаных за тысячагоддзі сусветнай гісторыі, якія павінны арганічна спалучацца з духоўнымі нацыянальнымі каштоўнасцямі. Менавіта ўсё гэта будзе садзейнічаць фарміраванню самостойнасці мыслення, пашырэнню кругагляду і светаўяўленню студэнта, а таксама праяўленню талярантнасці, ўзаемапаразумення і г.д.

Адносна студэнтаў-юрыстаў, на наш погляд, перш за ўсё неабходна сканцэнтраваць увагу на дасягненнях у сферы айчыннай прававой культуры, якія знайшлі адлюстараванне ў працах шматлікіх папярэдніх навукоўцах, перш за ўсё правазнаўцаў, філосафаў, сацыёлагаў, а таксама ў помніках права. Так, вывучэнне гістарычных філасофскіх і прававых крыніц, так і інтэпрэтацыя іх даследчыкамі і выкладчыкамі адыгрывае важную роль у захаванні гістарычнай памяці. Тым больш, што адны і тыя ж крыніцы ў розныя гістарычныя перыяду трактаваліся па-рознаму. Пры гэтым такую амбівалентную пазіцыю ў адносінах да тэкстаў часам выказваў адзін і той жа даследчык у розны перыяд сваёй дзейнасці. Часцей за ўсё гэта было абумоўлена існуючай грамадска-палітычнай сітуацыяй, або палітычнымі схільнасцямі даследчыка, ці іншымі аб’ектыўнымі і суб’ектыўнымі фактарамі. Менавіта таму застаецца важнай праблема непрадузятага аналізу гістарычных тэкстаў у кантэксце агульнага асэнсавання складанага шляху развіцця беларускай нацыі, яе самасвядомасці і самапазнання.

У гэтым кантэксце даследаванне прававой спадчыны беларускага народа, якое даволі доўга стрымлівалася шэрагам фактараў, а таксама правільная трактоўка яго дае студэнтам-юрыстам уяўленне не толькі аб асаблівасцях дзяржаўна-прававога развіцця на тым ці іншым гістарычным этапе, але і ўзроўні прававой культуры тагачаснага грамадства Студэнты-юрысты павінны непасрэдна знаёміцца з помнікамі айчыннага права, аналізаваць іх, супастаўляць з прававымі крыніцамі іншых дзяржаў, пры гэтым звяртаць увагу на асаблівасці функцыянавання і гістарычнага развіцця нарматворчых і іншых дзяржаўных органаў, судовай сістэмы, заканадаўства, а таксама - на

праблемныя і дыскусійныя пытанні айчыннай гісторыі дзяржавы і права. Пры выкладанні гісторыі дзяржавы і права Беларусі патрэбна звярнуць увагу студэнтаў, што дзяржаўнасць як навуковая катэгорыя ўяўляе сабой неад'емнае права этнанацыянальнай супольнасці, яе патэнцыяльную здольнасць і практычную магчымасць працяглага самастойнага гістарычнага існавання і развіцця, а дзяржава (дзяржаўнае ўтварэнне) — канкрэтна-гістарычную форму рэалізацыі гэтага права ў часе і прасторы. Беларуская дзяржаўнасць як адзінае цэлае знайшла ўвасабленне ў дзвюх непарыўных формах — гістарычнай і нацыянальнай. Менавіта на сучасным этапе развіцця дзяржаўнасці вельмі важным стаў нацыянальна-дзяржаўны падыход у яе вывучэнні, пры якім гісторыя ўласнага народа становіцца прыярытэтным кірункам навуковых даследаванняў.

У сувязі з гэтым востра паўстае праблема захавання гістарычнай памяці беларускага народа як гаранта яго соцыякультурнай ідэнтычнасці, у тым ліку звязаная з ёю пытанне статуса беларускай мовы. Пры выкладанні прадмета гісторыі дзяржава і права Беларусі абавязкова звяртаецца ўвага на тое, што беларуская мова доўгі гістарычны перыяд была дзяржаўнай. Многія беларускія навукоўцы (гісторыкі, правазнаўцы, мовазнаўцы і інш.) пазначалі, што паколькі палітыка-эканамічным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага былі беларускія землі (пад назвай «Літва»), якія і складалі цэнтральную частку дзяржавы, тагачасная беларуская мова была прызнана дзяржаўнай на ўсёй тэрыторыі Вялікага Княства [3, с. 73]. На падставе аналізу помнікаў права замежныя і айчынныя навукоўцы ўпэўнена сцвярджалі і сцвярджаюць, што ў помніках права, асабліва ў Статутах 1529, 1566, 1588 гг., знайшла адлюстраванне багатая прававая культура беларускага народа, а беларуская прававая лексіка склала аснову гэтых помнікаў права. У Статутах праявіўся "дзелавы стыль старабеларускай літаратурна-пісьмовай мовы, асобныя характэрныя рысы якой былі адзначаны ў прывілеях, пацвярджэннях, тэстаментах і г.д., што дазваляе гаварыць пра старабеларускую дзелавую пісьменнасць як сістэму тэкстаў, аб'яднаную сферай функцыянавання, прызначэннем, тыповымі моўнымі сродкамі" [4, с. 68-69]. Менавіта ўсё гэта сведчыць аб значнай сфарміраванасці і высокім ўзроўні заканадаўчых творчасці і тэхнікі ў Вялікім Княстве Літоўскім, што ў сваю чаргу рабіла даволі эфектыўным уздзеянне закона на палітычнае, сацыяльна-эканамічнае і культурнае жыццё дзяржавы.

Неабходна адзначыць, што ўжо Першы Статут 1529 года, як вынік першай агульнай сістэматызацыі права Вялікага Княства Літоўскага, узнёс прававую сістэму дзяржавы на больш якасны ўзровень. З гэтага часу ў дзяржаве быў пакладзены пачатак больш важнага этапу развіцця сістэматызаванага заканадаўства на мове, даступнай насельніцтву Вялікага Княства Літоўскага. Таксама на беларускай мове былі напісаны некалькі пазней Статуты 1566 і 1588 гадоў. Знакаміты даследчык І. Даніловіч пісаў, што Статуты "написаны на "простонародном литовско-русском наречии" [5, с. 16, 34]. Зразумела, што мелася на ўвазе тагачасная беларуская мова. Таксама А.Міцкевіч пазначаў

адносна беларусаў, што «пісьмовых помнікаў у іх мала, толькі Літоўскі Статут напісаны іх мовай, самай гарманічнай і з усіх славянскіх моў найменш змененай” [6, с. 230]. Пры гэтым ён казаў не пра тоеснасць народных гаворак і кніжнай мовы, а пра кніжна-дзелавую форму літаратурнай мовы таго перыяду. Увогуле многія навукоўцы пазначалі, што характэрнай рысай культурна-гістарычнага працэсу XVI ст. было выкарыстанне беларускай мовы не толькі ў сферах дзелавой пісьменнасці, у тым ліку ў заканадаўстве, але і ў асноўных жанрах свецкай літаратуры.

Мовай Статутаў вельмі ганарыліся заканадаўцы. Так, у прадмове да Статута 1588 года Леў Сапега адзначаў “… не обчым яким языком, але своим власным праваписаные маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можем” [7, с. 47]. Аб гэтым гаварылася і ў самім тэксце Статута. Напрыклад, у арт.1 чацвертага раздзела пра абавязкі судовага пісара было напісана: «…А писар земский маеть порускu литерами и словы рускими вси листы, выписы и позвы писати, а не иншим езыком и словы» [7 р. 4, арт. 1]. Пры гэтым неабходна сказаць, што значэнне Статута 1588 года ўзрастала ад таго, што ён быў амаль адразу надрукаваны на беларускай мове ў Віленскай тыпаграфіі братоў Мамонічаў, што рабіла яго больш даступным шырокаму колу насельніцтва.

Многія даследчыкі статутнага заканадаўства падкрэсліваюць, што ўсе тры Статуты былі напісаны на зразумелай насельніцтву Вялікага Княства Літоўскага мове, якая была прызнана дзяржаўнай. Напрыклад, літоўскія навукоўцы, акцэнтуючы ўвагу на сутнасці, значэнні і дасканаласці Статутаў, пісалі, што яны быў напісаны на старажытнай беларускай мове, “прочно утвердившейся к тому времени в качестве языка великокняжеской канцелярии” [8, s. 12.]. Аб гэтым жа пісаў у свой час вядомы літоўскі даследчык С. А. Лазутка. Таксама і знакаміты польскі гісторык права Ю. Бардах пазначыў, што Статуты былі напісаны на старажытнай беларускай мове, якая была дзяржаўнай у Вялікім Княстве Літоўскім [9, s. 190].

Некалькі пазней Я. Карскі ў сваёй фундаментальнай працы «Беларусы» пісаў, што ў часы Вялікага Княства Літоўскага былі канчаткова выпрацаваны асаблівасці беларускай мовы. Першы рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта У. І. Пічэта, падтрымліваючы меркаванне свайго вучня В. Д. Дружчыца, акцэнтаваў увагу на тым, што мова Статутаў – гэта мова беларускага пісьменства, дасягнуўшага ў XVI ст. высокага развіцця, і хоць яна некалькі адрознівалася ад жывой народнай гаворкі, аднак фанетычна і марфалагічна была беларускай [10, с. 491 і інш. ]. Увогуле ўсё гэта сведчыць не толькі пра беларускую прыналежнасць Статутаў, але і пра беларускую сутнасць самога Вялікага Княства Літоўскага.

Адзначаючы моўныя асаблівасці статутнага заканадаўства, шматлікія навукоўцы-мовазнаўцы (А.І. Жураўскі, Л.М. Шакун, І.І. Крамко, М.А. Новік і інш.) падкрэслівалі што яны служылі узорам і крыніцай граматычных і лексічных сродкаў і спецыяльнай юрыдычнай тэрміналогіі для пісцоў

наступных дзесяцігоддзяў. Менавіта на гэта акцэнтуюць увагу выкладчыкі гісторыі дзяржаы і права Беларусі.

Увогуле на лекцыях і семінарскіх занятках выкладчыкі звяртаюцца да многіх праблемных пытанняў паэтапнага гістарычнага развіцця беларускай дзяржаўнасці. Выказваючы ўласнае меркаванне па дыскусійных пытаннях, яны робяць спасылкі на тэксты помнікаў права, на найбольш важныя і найноўшыя навуковыя публікацыі, рэкамендуюць студэнтам самастойна азнаёміцца з імі, каб потым абгрунтаваць уласныя пазіцыі. Пры гэтым выкладчыкі абавязкова закранаюць у параўнальным аспекце многія сучасныя дзяржаўна-прававыя праблемы, прыводзяць гістарычныя і сучасныя прыклады належнай і ўзорнай грамадскай дзейнасці, служэння беларускаму народу, імкнення да захавання нацыянальных каштоўнасцей, а таксама прыклады сумленных адносін да любой працы, што, несумненна, мае метадалагічны і выхаваўчы характар.

Практыка выкладчыцкай дзейнасці паказвае, што вывучэнне студэнтамі гісторыі дзяржавы і права Беларусі садзейнічае не толькі сістэмнаму засваенню вучэбнага курса і фарміраванню дакладных ўяўленняў аб храналагічнай паслядоўнасці, этапах і асаблівасцях гістарычнага развіцця беларускай дзяржавы і яе прававой сістэмы, але з’яўляецца важкай падставай для паспяховага засваення студэнтамі іншых юрыдычных дысцыплін і ў выніку – належнай падрыхтоўкі будучых заканадаўцаў і правапрымяняльнікаў. Набытыя веды дапамагаюць будучым юрыстам стаць сапраўднымі прафесіяналамі ў прававой сферы, а таксама інтэлектуальнымі асобамі з шырокім навуковым светапоглядам і ўласнай грамадзянскай пазіцыяй па пытаннях грамадска-палітычнага і дзяржаўна-прававога жыцця Беларусі. Акрамя таго, засваенне ўласнай гісторыі садзейнічае не толькі фарміраванню прафесіяналаў з высокай эрудыцыяй і культурай, але і выхаванню іх у духу патрыятызму і павагі да гістарычнага мінулага і дасягненняў продкаў.

Пры гэтым нельга забываць, што гісторыя выступае ў інфармацыйнай прасторы як аб’ект процiборства. Навукоўцы падкрэсліваюць, што ў сучасны перыяд “…множатся возможности внешних деструктивных воздействий на национальный исторический процесс» [11, с. 7]. Тым больш, што адсутнасць сістэмных ведаў у сферы айчыннай гісторыі і неразвітасць крытычнага мыслення пры ацэнцы гістарычных звестак прыводзіць да таго, што моладзь надае перавагу Інтэрнэту ў параўнанні з іншымі крыніцамі, таму часам аўтаматычна суадносіць любыя паведамленні ў сацыяльных сетках і на тэматычных сайтах з рэчаіснасцю, не можа адрозніць гістарычны факт ад выдумкі. Увогуле лічбенные тэхналогіі здольны параджаць змяшэнне фактаў, а ва ўмовах палітызацыі гісторыі і пад ўплывам надзвычайнага даверу сродкам масавай інфармацыі, у тым ліку публікацыям у Інтэрнэце і іншым падобным крыніцам, сфарміраваць у асяроддзі моладзі аднамерную памылковую гістарычную памяць і комплекс нацыянальнай непаўнавартасці.

У сувязі з гэтым асабліва важнай задачай вучэбнай дысцыпліны гісторыі дзяржавы і права Беларусі на сучасным этапе з’яўляецца аналітычнае

вывучэнне гісторыі нашай дзяржаўнасці з выяўленнем аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў гістарычнага развіцця, з высвятленнем "белых плям", супярэчнасцей, недакладнасцей і інш. Пры гэтым вывучэнне прадмета належыць паставіць на новую метадалагічную і тэарэтычную аснову, якая дазволіць студэнтам не толькі засвоіць асноўныя гістарычныя факты і падзеі, але навучыць іх супастаўлять розныя падыходы ў гісторыяграфіі, ацэньваць уплыў на гістарычнае развіццё разнастайных фактараў, выяўляць характэрныя асаблівасці і тэндэнцыі паэтапнага гістарычнага развіцця беларускай дзяржаўнасці. Усё гэта будзе садзейнічаць не толькі засваенню глыбокіх ведаў, але дапаможа студэнтам мысліць самастойна і маштабна, навучыць іх супастаўляць, аналізаваць і рабіць належныя абгрунтаваныя вывады, пазбягаючы пры гэтым аднабаковых, мала звязаных з рэчаіснасцю ацэнак і вывадаў. Увогуле фарміраванне гістарызма мышлення стане падставай не толькі належнай падрыхтоўкі юрыстаў-прафесіяналаў, але і станаўлення высокаадукаванай культурнай асобы з нацыянальна-каштоўнаснымі арыенцірамі, што ў сваю чаргу будзе садзейнічаць далейшаму паспяховаму развіццю беларускай дзяржаўнасці.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Доўнар, Т.І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі : падручнік / Т.І. Доўнар. – Мінск : Адукацыяі выхаванне, 2014. – 438 с.

2. Доўнар, Т.І. Дасягненні і недахопы ў развіцці гісторыка-прававой навукі Беларусі / Т. І. Доўнар // Права.by. – 2015. – № 2 (34). – С.38-45.

3. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: Вучэб. дапам. / Я.А. Юхо. – Мінск: Універсітэтскае, 1992. – 270 с.

4. Паляшчук, Н.В. Кампазіцыя і змест заканадаўчых артыкулаў Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588: лінгвастылістычны аспект / Н.В. Паляшчук // Матэрыялы IX Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў "Статут Вялікага Княства Літоўскага ў гісторыі культуры Беларусі (Мінск, 18-19 красавіка 2-13 г.) / Нацыянальная біблятэка Беларусі ; складальнікі: Т. А. Сапега, А. А. Суша. – Мінск, 2013. –261 с.

5. Данилович, И. Взгляд на литовское законодательство и литовские Статуты / И. Данилович // Юридические записки, издаваемые П. Редкиным. – Москва, 1841. – Т.1. – С.1-46.

6. Mickewicz, A. Dziela wszystkie : w 16 t. [Wydanie sejmowe] / A. Mickewicz.- Warszawa : Nakl. Skarbu RP, 1933. – T.16: Rosmowy z Adamem Mickewiczem /zebral i oprac. S. Pigon ; przedmowe hapisal W. Mickewicz. – 1933. – 560 s.

7. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – 573 с.

8. Pirmasis Lietuvos Statutas – Первый Литовский Статут. – Vilnius. V.: Mintis, 1983. – 420 p.

9. Bardach, J. Statuty Litewskie a prawo rzymskie / J. Bardach. – Warszawa : Centre for Studies on the Classical Tradition in Poland and East-Central Europe; Uniw. Warszawski, 1999. – 160 s.

10. Пичета, В.И. Белоруссия и Литва XV – XVI вв. / В. И. Пичета. – М.: Изд-во АН БССР, 1961. — 815 с.

11. Коршунов, Г.П. Проблема исторической памяти на цифровом изломе эпох / Историческая память о Беларуси как фактор консолидации общества : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 26-27 сентября 2019 г. / под ред. : Коршунов Г.П. (гл. ред) .) [и др.]; НАН Беларуси, Ин-т социологии НАН Беларуси, Минск : ООО “СУГАРТ”, 2019. С.229-231. (всего 360 с.)

## РЕАЛИЗАЦИЯ ПРАВА НА ОХРАНУ ЗДОРОВЬЯ В РАМКАХ РАЗВИТИЯ ЭЛЕКТРОННОГО ЗДРАВООХРАНЕНИЯ

**В.В. Дорина**
*ассистент кафедры конституционного права*
*и государственного управления юридического факультета*
*УО «Полоцкий государственный университет»*

Развитие информационных технологий в последние годы стало приоритетным направлением развития Республики Беларусь. Декрет Президента Республики Беларусь № 8 «О развитии цифровой экономики» подтвердил необходимость развития государства в данном направлении. Внедрение информационных технологий в том числе и в систему здравоохранения может стать одним из значимых этапов для реализации права человека на охрану здоровья. Актуальность темы невероятно возросла в силу развития пандемии COVID-19 в 2020 году, в силу чего возможность получать услуги здравоохранения, не выходя из дома, стала особенно востребована.

В замечаниях общего порядка № 14 Комитета по социальным, политическим и культурным правам были определены основные элементы, наличие которых необходимо для реализации права на охрану здоровья. Одним из элементов является *доступность* учреждений, услуг, товаров здравоохранения, которая включает несколько аспектов: недискриминацию, экономическую и физическую доступность, доступ к информации.

Эти элементы наиболее продуктивно можно реализовать с помощью системы электронного здравоохранения, суть которой заключается в повышении качества медицинского обслуживания населения, доступности услуг, предоставляемых системой здравоохранения, информированности населения о состоянии собственного здоровья, применение современных информационно-коммуникативных технологий при планировании лечебно-профилактических мероприятий с учетом возможностей медицинских учреждений. Еще одним преимуществом с точки зрения принципа недискриминации при реализации права на охрану здоровья является отсутствие препятствий для получения услуги в рамках электронного